БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
БЕЛОРУССКОЕ ОБЩЕСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ
ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ РУССКОГО ЯЗЫКА И ЛИТЕРАТУРЫ

***К 70-летию
кафедры русской литературы
БГУ***

# РУССКАЯ И БЕЛОРУССКАЯ ЛИТЕРАТУРЫ

## *на рубеже XX—XXI веков*

Сборник научных статей
В двух частях
Часть 1

Под редакцией профессора С. Я. Гончаровой-Грабовской

Минск «РИВШ» 2010

Репозиторий БарГУ

УДК
ББК
Н

**Р е к о м е н д о в а н о**
Ученым советос филологического факультета
Белорусскго государственного университета
(протокол № 6 от 27 мая 2010 г.)

**Рецензенты:**
доктор филологических наук, профессор *Т.Е. Комаровская;*
доктор филологических наук, профессор *Л.Д. Синькова*

***Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :***
доктор филологических наук, профессор
*С. Я. Гончарова-Грабовская* (отв. ред.);
доктор филологических наук, профессор *А.И. Бельский*;
доктор филологических наук, профессор *И. С. Скоропанова;*
доктор филологических наук, профессор *А.А. Станюта;*
доктор филологических наук, профессор *А.А. Нестеренко*
кандидат филологических наук, старший преподаватель *У. Ю. Верина* (зам. отв. ред.)

**Русская и белорусская** литературы на рубеже XX—XXI вв.: сборник научных статей. В 2 ч. Ч. 1 / под ред. С. Я. Гончаровой-Грабовской. — Минск: РИВШ, 2010. — ___ с.
**ISBN**

Сборник создан по итогам международной научной конференции, прошедшей в Белорусском государственном университете. Научные статьи отражают тенденции развития современного литературного процесса, его проблематику и поэтику.

Рассчитан на литературоведов, преподавателей и студентов филологических и культурологических специальностей.

Издание подготовлено на кафедре русской литературы БГУ.

**УДК**
**ББК**

© Коллектив авторов
© БГУ, 2010

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

*А. І. Белая (Баранавічы)*

## БЕЛАРУСКІ ХУТАР ЯК МАДЭЛЬ БЫЦЦЯ ЧАЛАВЕКА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ М. ГАРЭЦКАГА, Г. ДАЛІДОВІЧА, Г. МАРЧУКА)

Сюжэты і вобразы беларускай прозы пераканаўча пацвярджаюць, што, не маючы магчымасці самаідэнтыфікавацца адносна дзяржаўнага цэлага, якое пастаянна мянялася, «тутэйшы» самаідэнтыфікаваў сябе з адзіна непарушным, адвечным — з роднай зямлёй. Невыпадкова яна стала генеральнай дамінантай многіх твораў беларускай літаратуры. Топас зямлі натуральным чынам лакалізаваўся ў айчыннай прозе як топас хутара.

Хутар паўстае своеасаблівым апірышчам індывідуальнасці ў свеце, які паслядоўна яе нівеліруе. Таму ў шэрагу мастацкіх характараў, створаных беларускімі празаікамі, адметнае месца займае «чалавек на хутары». Так заявіў пра свайго героя Лявона Бушмара К. Чорны. У беларускім літаратуразнаўстве гэты вобраз досыць грунтоўна даследаваны. Пагодзімся з М. Тычынам, што хоць «у прамове абвінаваўцы гучыць адназначнае асуджэнне “бушмараўшчыны”… мастацкая тканіна аповесці сведчыць аб тым, што Чорны з увагай прыглядаўся да гэтага чалавечага тыпу, а ў наступных творах не раз вяртаўся да паказу вобразаў, блізкіх па жыццёвай пазіцыі Бушмару» [1, с. 349].

Мастакоўская ўвага да чалавека на хутары абумоўлена прычынамі не толькі сацыяльна-палітычнага характару. «У адрозненне ад плеяды рускіх пісьменнікаў і паэтаў, большая частка якіх нарадзілася і атрымала першапачатковую адукацыю і выхаванне ў памешчыцкіх сядзібах, большасць класікаў беларускай паэзіі і прозы — з’явы выключна прыродна-сельскія, а дакладней, прыродна-хутарскія» [2, с. 356]. Менавіта ў натуральна-прыродных умовах фарміраваліся іх базавыя алгарытмы, каб пасля трансфармавацца па эстэтычных законах, што ў поўнай меры датычыць творчасці Г. Далідовіча. Яго радзіма — хутар Амшарок, і гэтую частку сваёй знешняй біяграфіі пісьменнік аддае героям рамана «Заходнікі» Грыгарцэвічам. Хутар Грыгарцэвічаў мы бачым вачыма старшыні сельсавета Кураглядава: «У двары Кураглядаў здзівіўся: глядзі ты, плошча малая… але тупка, чыста» [3, с. 349]. Гэта вынік клопатаў такіх, як Францішак Грыгарцэвіч, «талковых гаспадароў», «гаспадарлівых і мудрых», але, паводле думкі Кураглядава, «нелаяльных хутаранцаў» [3, с. 43].

З адметнасці беларускага хутара як мадэлі чалавечага быцця вынікае спецыфіка беларускай ідэнтычнасці — падзел на «ўсходнікаў» і «заходнікаў». Гэтая праблема, у прыватнасці, прыцягвала ўвагу У. Калесніка. Ён бачыў яе як праблему дэфармацыі архетыповых этнічных рыс у жыхароў усходніх абласцей, што з’явілася прадметам палемікі ў час сумесных з Я. Брылём і У. Караткевічам падарожжаў па былой Заходняй Беларусі. Думка Караткевіча была песімістычнай: «…нас, усходнікаў, дзесяткі гадоў адвучвалі ад працы, прывучалі да голаду і калгасаў…» [4, с. 67]. Аднак тэма была для яго балючай, таму часам у спрэчках ён выяўляў непаслядоўнасць. Калі ж У. Калеснік заўважыў, што заходнікі маюць гаспадарскую псіхалогію, то, абараняючы сваіх землякоў, У. Караткевіч запярэчыў: гэтая псіхалогія аднаасобніцкая, а «ўсходнікі даўжэй жывуць у сацыялістычных умовах, выпрацавалі калектывісцкую псіхалогію» [4, с. 104]. Апаненты, аднак, пагадзіліся на думцы, што

Репозиторий БарГУ

галоўнае ў сацыяльнай псіхалогіі — гэта годнасць, маючы на ўвазе перш за ўсё «Коласаў прынцып годнасці селяніна» [4, с. 104], звязаны з набыццём зямлі, уласнага кута. У. Калеснік задае слушнае пытанне: «А хто ж раней быў раскулачаны, пазбаўлены ўласнай зямлі: усходнікі ці заходнікі? Дзе раней калектывізацыя абеззямеліла селяніна, а значыць і мацней падкасіла аснову годнасці?» [4, с. 104—105]. Да «заходнікаў» Г. Далідовіча цалкам стасуецца меркаванне героя апавядання І. Піліпава «Гордасць»: «…калі ты чалавек, маеш у сабе сэрца, душу і розум, — то ты горды, а гордасць — гэта спазнанне, хто ты такі» [5, с. 268]. У вуснах Кураглядава гэта гучыць так: «Мужыкі мужыкамі, а нос дзяруць! Пачакайце, будзе не тое, што вы хочаце. А тое, што мы зробім! Пакажам яшчэ калхозную жысць — хопіць… бліны на два бакі маслам мазаць!..» [3, с. 52]. Сапраўды, «там, дзе драбнее ўласнасць, драбнее і псіхалогія. Нараджаецца парабкоўская абыякавасць і безгаспадарчасць пустальгі», і гэта адна з прычын адрознасці псіхалогіі «ўсходнікаў», але ў цэлым яна не горшая, чым у «заходнікаў», а — іншая. Вартая павагі наступная пазіцыя У. Калесніка як творцы і грамадзяніна: «Калі ты станеш апісваць калгаснікаў толькі ружовымі фарбамі, то праявіш лакейскую псіхалогію» [4, с. 105].

Сэнсава-каштоўнаснымі велічынямі таго ж парадку, што і хутар, паўстаюць у мастацкай прозе пчэльня і млын, а ў дэфармацыі або ўвогуле знікненні звязаных з імі прафесій і адпаведных чалавечых тыпаў бачыцца пагроза як спрадвечнаму мудраму ўсталяванню жыцця і прыватнаму жыццю дбайнага, рупнага чалавека, так і яго праву быць па-мастацку праўдзіва адлюстраваным. У беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя мы яшчэ не знаходзім завершанага ў сваёй цэласнасці індывідуалізаванага вобраза пчаляра, значнага для ўсіх часоў і народаў, як, напрыклад, Савасьян у Л. Ляонава («Петушыхінскі пралом», 1922). У асобных заўвагах і праекцыях адчуванняў героя ўтрымліваецца вялікі прарочы сэнс. Пасля сустрэчы з «кожаным человеком» Савасьян «…шёл к себе в овраг, и яма росла внутри его…» [6, с. 161]. Перад тым як чацвёра функцыянераў новай улады апаганілі мошчы святога Пафнуція, пісьменнік паказвае, што «висела смешно и грустно в бороде Савосьяновой заблудившаяся и мёртвая теперь пчела» [6, с. 165]. Калі Петушыху напаткаў мор, «шёл полем Савосьян… и всё глядел, и всё думал, что не всегда слепым худо быть» [6, с. 176].

Агульначалавечы абрыс вобраза пчаляра азначаны Л. Калюгам праз уяўленні дзівакаватага Клемаса Віткі. «Не так ужо й блага — пчаляр. Тут адзіная нязручнасць, што вельмі ж у тых мух пякучыя джалы. Але да іх можна прывыкнуць. А спакоем, ласкаю й свой характар ураўнаважыш, і з драбязою гэтаю можна добрыя дачыненні ўстанавіць. І гэта дзе-небудзь у

Репозиторий БарГУ

глушы, у Палессі» [7, с. 499] — глушы, падобнай да легендарнай ляонаўскай Петушыхі, задуманай Усявышнім для чалавечага шчасця…

Пэўную ідэйна-мастацкую сувязь з творам Л. Ляонава можна адзначыць і ў апавяданні М. Гарэцкага «Багатая пчэльня». Яе безыменны герой — «заможны зямец», які надта ж умеў «хадзіць ля пчол» [8, с. 42]. Пчаляр не пазбаўлены прадпрымальніцкіх здольнасцей, што дазволілі яму праз кароткі час «аграбаць раёў» і «плаваць у мяду». М. Гарэцкі падкрэслівае ў асобе героя такія вартасці, як памкненне да згоды, «тараватасць», дбайнасць. Адно што не любіў ён, «калі хто лез к яму ў рабоце», і пчэльня яго мела шчыльныя паркан і дзверцы, што таксама сведчыць пра імкненне талерантнай у цэлым асобы да захавання сваёй духоўнай аўтаноміі. «Слаўная пчэльня», як яе характарызуе М. Гарэцкі, была ўладкавана надзвычай мэтазгодна і практычна, а да таго ж валодала «салодкім хараством», якое разам утваралі навакольныя краявіды, гукі, фарбы і пахі. У пачатку апавядання М. Гарэцкі падкрэслівае, што яго герой жыў пры паншчыне. Аднак дата напісання твора (1921) і аўтарскае рэзюме «Сумны канец мела гэтая слаўная пчэльня, як і многае тады, у тым мінулым часе» [8, с. 44], дапускаюць меркаванне, што мастацкі час, як і ў «Петушыхінскім праломе», утрымлівае калізіі эпохі войн і рэвалюцый, якая паклала пачатак асабовай і грамадскай дэструкцыі, справакавала «великий пролом не в одном человеческом сердце» [6, с. 138], парушыла заканамернасць эвалюцыі і паставіла пад сумненне магчымасць пераходу асоб «сярэдняга тыпу», якімі выступаюць хутаране, «заходнікі», пчаляры, «зямцы», млынары і падобныя да іх літаратурныя героі, на наступную ступень духоўнага развіцця. У апавяданні М. Гарэцкага «Літоўскі хутарок» Ян Шымкунас «жаліўся: “Ах, Божа мой! Не пашкадавалі маіх пчолак. Чужы пакрыўдзіў і свае ж не даруюць» [8, с. 445]. Тут сцвярджаецца тая ж гуманістычная думка, што і ў творы Л. Ляонава — несумяшчальнасць залатых пчол жыцця і чорных мух вайны і смерці. Аналіз асаблівасцей такога мастацкага тыпу, як пчаляр у Л. Ляонава, схіляе таксама да роздуму пра глыбокую філасофска-эстэтычную сувязь вобразаў «новай зямлі» і пчаляра ў паэме Я. Коласа.

Адзначаныя вышэй вобразы «людзей з хутара», за выключэннем Бушмара, з’яўляюцца носьбітамі некаторых ідэальных рыс, на што ў кожнага з аўтараў ёсць свае прычыны. Гэтага, аднак, нельга сказаць пра Змітра Летуна з рамана Г. Марчука «Крык на хутары», героя амбівалентнага. На гэтым вобразе аўтар пераканаўча выяўляе, як менавіта зямля абумоўлівае і памкненні героя, і яго супярэчлівыя рысы, штурхае то на несамавітыя, то на самаахвярныя ўчынкі, служыць то каменем спатыкнення, то апраўданнем.

Репозиторий БарГУ

Калі пошукі «новай» зямлі героямі Я. Коласа павінны былі даць ім не толькі сілы, а і волі, то на этапе набыцця ўласнага хутара Лятун робіць сваіх дзяцей катаржнікамі, але і сам ён, як пісаў І. Мележ, — «камандзір катаржнай каманды». Нават калі пачынае пагаршацца здароўе, Змітро наадрэз адмаўляецца ехаць у бальніцу, перажываючы за «хазяйства»… У гэтым вобразе пазнаюцца і рысы мележаўскага Карча, і брылёўскага Хамёнка: ад'язджаючы «на лёды», Лятун наказваў дзецям не аб'ядацца што свінні, перабівацца, акрамя хлеба, шчаўем і затаўкай…

Г. Марчук уважліва сочыць за тым, як, стаўшы хутаранцам, Лятун з надзеяй, а больш з трывогай прыглядаецца да сыноў — каму з іх можна будзе даверыць справу свайго жыцця? У выніку аддае перавагу Юзіку, які «кінуў школу, быў пры бацьку… Быў заняты справай і вучыўся гаспадарыць» [9, с. 70]. Зрэшты, коласаўскі Міхал ужо ў пачатку мінулага стагоддзя разумеў, што «грунт пад нагамі» — не толькі зямля, а і навука.

Нават чуткі аб вайне не здаюцца Змітру пагрозлівымі. Ён упэўнены, што яго хутар «з краю». Між тым, праб'е час, і вобраз Летуновага хутара, як хутара Багацькаў у «Знаку бяды», узбуйніцца да маштабаў усёй шматпакутнай Беларусі, а ў абліччах яго дзяцей адаб'ецца адметнае ў кожным выпадку адценне спектру пакутніцкага нацыянальнага быцця.

Трэба адзначыць таксама, што зайздросная ўпартасць Летуна сабраць грошы і купіць зямлю прымушала «паважаць гэтага беднага селяніна», які хацеў не арандаваць зямлю, а мець «сваю крэўную», каб, як ён кажа, «толькі мае правы былі на яе, як у бога на мяне". Асаблівасці сюжэту твора і паказу ўнутранага свету гэтага героя робяць пераканаўчым наступны яго ўчынак: «Змітро ўпаў на калені і пацалаваў сваю зямельку» [9, с. 43]. «Угору пайшоў», — скажуць аб ім, але гэта, на жаль, будзе пачаткам маральнага заняпаду Летуна, які быў перакананы: нішто, акрамя ўлады і зямелькі, не корміць. Стаўшы гаспадаром хутара, ён відочна змяніўся, бо «пачуццё асабістай незалежнасці расло як на дражджах да фанабэрыі, абыякавасці да іншых, нават нахабнай смеласці» [9, с. 142]. Мусіць, ад немагчымасці атрымаць уладу Змітро пачынае выяўляць нематываваную на першы погляд агрэсіўнасць. Жывучы «за якіх-небудзь пяцьдзесят кіламетраў ад Расіі», дзе, ён чуў, усё ў чалавека забіраюць, Лятун не мог не задумвацца аб тым, што будзе, калі прыйдуць сюды. З пункту гледжання заўсёднага здаровага сэнсу яму было цяжка паверыць, што ўсё забяруць, ні за што ні пра што, і ён вырашае, што будзе абараняць свой хутар…

Невыпадковым бачыцца той штрых да аблічча Летуна, што ён «любіў і паважаў сабак за адданасць і цярплівасць да гаспадара». Верагодна таму, што не бачыў такіх якасцей у людзях вакол сябе. А яшчэ гэта і паказчык чалавечай адзіноты сярод людзей, «цягучай, як мёд, але горкай, як перац»

Репозиторий БарГУ

[9 , с. 92]. Надзвычай паказальна таксама, што Змітро памірае ад хваробы сэрца. Па-першае, памерці ў вайну ад хваробы (як, напрыклад, быкаўскі Гарадзілаў) — увогуле вялікая раскоша, свайго роду ўзнагарода. Па-другое, аказалася, што ў «бессардэчнага» Летуна сэрца ўсё ж ёсць і ён паспеў перад смерцю скінуць з яго страшэнны цяжар…

Такім чынам, распаўсюджанасць вобраза хутара ў айчыннай прозе абумоўлена асаблівасцямі беларускага «кормячага ландшафту», у тым ліку і як асяроддзя фарміравання творчай асобы, што робіць заканамернай увагу пісьменнікаў да постаці «чалавека на хутары», які паказана пераважна як амбівалентны герой або носьбіт ідэальных рыс, асабліва ў тых выпадках, калі імкнецца не толькі да «новай зямлі», а і да «новага неба». Беларускі хутар як мадэль быцця чалавека вызначае не толькі індывідуальнае і тыповае ў літаратурных характарах, а і дазваляе пашырыць уяўленне аб праблеме нацыянальнай ідэнтычнасці, увасобленай як мастацкі феномен у прозе мінулага і бягучага стагоддзяў. Перспектыўнымі напрамкамі ў святле акрэсленай праблемы можна лічыць даследаванне такіх з’яў беларускай топікі, як пчэльня і млын, у іх сувязі з сацыяльнымі і мастацкімі характарамі і тыпамі.

---


1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. — Мінск, 1999. — Т 2.: 1921—1941.

2. *Кириенко, В. В.* Природно-климатические детерминанты формирования белорусского этноса и менталитета белорусов // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8—9 декабря 2005 г., Гродно / отв. ред. проф. М. А. Можейко. — Гродно, ГрГУ, 2006. — С. 350—356

3. *Далідовіч, Г.* Заходнікі / Г. Далідовіч. — Мінск, 1998.

4. *Калеснік, У.* Усё чалавечае: літ. партр., арт., нарысы / У. Калеснік. — Мінск, 1993.

5. На ўсходзе сонца: Творы беларус. пісьменнікаў пач. XX ст. / Аўт., прадм. і ўклад. У. М. Казбярук. — Мінск, 1990.

6. *Леонов, Л.* Повести и рассказы / Л. Леонов. — Л., 1986.

7. *Калюга, Л.* Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты / уклад., прадм. Я. Лецкі; камент. Н. В. Гаўрош, Т. М. Трыпуцінай / Л. Калюга. — Мінск, 1992.

8. *Гарэцкі, М.* Прысады жыцця: апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі; уклад. Т. Голуб. — Мінск, 2003.

9. *Марчук, Г.* Крык на хутары / Г. Марчук // Крык на хутары. Кветкі правінцыі: раманы. — Мінск, 1998. — С. 3—219.


Репозиторий БарГУ